единичными примерами: *Казарма Шлюбоўшчына, Пасёлак Абаб'е, Пошта Абаб'е, Раз'езд Замошша*.

Заключение. Таким образом, для большинства составных ойконимов региона характерно преобладание оппозиционных отношений, что вполне объяснимо: атрибутивный компонент выполняет разграничительную функцию (это, собственно, и является основной причиной появления составных названий).

Список литературы

1. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцебская вобласць: нарматыўны даведнік / У.М. Генкін, І.Л. Капылоў, В.П. Лемцюгова. – Мн.: Тэхналогія, 2009. – 668 с.

РЭЦЭПЦЫЯ АНТЫЧНАЙ МІФАЛОГІІ Ў ІДЫЛІІ Ф.Д. КНЯЗЬНІНА "ЦЫКЛОП ПАЛІФЕМ"

Г.А. Гладкова
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

Выхадзец з беларускіх земляў, Францішак Дыянізы Князьнін – вядомы польскамоўны пісьменнік другой паловы XVIII стагоддзя, лірык-сентыменталіст, драматург, перакладчык. Акрамя асобных публікацый, літаратурная спадчына пісьменніка была сабраная ў сямітомным варшаўскім выданні 1828-1829 гг. Дыяпазон мастацкай творчасці Князьніна надзвычай шырокі: паэту належаць некалькі паэм ("Паветраны шар, або Пулаўскія вечары", "Размарын"), трагедыі ("Фемістокл", "Гектар"), лібрэта оперы ("Маці-спартанка"), шматлікія вершы-прысвячэнні, песні, оды, байкі, ідыліі і інш.

Нягледзячы на рознабаковыя даследаванні літаратурнай спадчыны Ф.Д. Князьніна ў польскай філалагічнай навуцы (працы Б. Мазурко, В. Баровага, Э Александроўскай, Т. Мікульскага, Т. Касткевіч і інш.), у беларускім літаратуразнаўстве творчасць пісьменніка яшчэ не актрымала належнага асэнсавання. Айчынныя навукоўцы звярнулі ўвагу на лацінамоўную творчасць Ф.Д. Князьніна (А. Жлутка), перакладалі на беларускую мову асобныя творы паэта (Л. Баршчэўскі, Н. Мерашчак, Л. Семянюк, І. Багдановіч і інш.). У сваіх працах згадвалі імя Ф. Князьніна, асэнсоўвалі яго ролю ў тагачасным літаратурным працэсе А. Мальдзіс, М. Хаўстовіч, І. Бурдзялёва, В. Еўмянькоў, Ж. Некрашэвіч-Кароткая і інш. Такім чынам, існуе аб'ектыўная неабходнасць комплекснага аналізу творчай спадчыны Ф.Д. Князьніна, што будзе спрыяць далейшаму асэнсаванню асаблівасцей літаратурнага працэсу на землях Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII стагоддзя.

Мэта – выявіць асаблівасці рэцэпцыі антычнай міфалогіі ў творы.

Матэрыял і метады. Аб'ектам увагі стала ідылія Ф. Д. Князьніна "Цыклоп Паліфем", якая ўяўляе сабой аўтарскае пераставрэнне на польскай мове Ідыліі XI "Кіклоп" старажытнагрэчаскага паэта Феакрыта. Даследаванне праведзена з дапамогай гістарычнага, літаратуразнаўчага і супастаўляльнага метадаў.

Вынікі і іх абмеркаванне. Ідылія – асобны літаратурны жанр, які ўзнік у Грэцыі ў III ст. да н.э. Яго стваральнікам лічыцца паэт Феакрыт, прадаўжальнікамі традыцый былі Мосх і Біён у Грэцыі, Вергілій у Рыме. Асабліва шырокае распаўсюджванне ідылія атрымала ў Заходняй Еўропе XVII–XVIII стст. У канцы XVIII – пачатку XIX стст. у перыяд сентыменталізму цікавасць да антычнай букалічнай паэзіі значна ўзрасла. Гэта было абумоўлена жаданнем сентыменталістаў супрацьпаставіць заганам цывілізацыі маральнасць вясковага жыцця, прыродны пачатак, свет непасрэдных пачуццяў.

Адзначым, што для XVIII ст. было характэрна пашырэнне ўяўленняў пра ідылічнае. У 1798 г. В. фон Гумбальдт заўважаў: "Словом «идиллия» пользуются не только для обозначения поэтического жанра, им пользуются также для того, чтобы указать на известное настроение ума, на способ чувствования" [2]. Такім чынам, ідылія – гэта не

Репозиторий ВГУ

толькі жанр, але і спецыфічны характар светаўспрымання, характэрны для эпохі Асветніцтва.

Шэсць ідылій Ф. Князьніна (дзве ўласныя і чатыры перакладныя) ўвайшлі ў другі том сямітомнага збору твораў паэта [3]. Адна з іх уяўляе сабой перастварэнне на польскай мове Ідыліі XI "Кіклоп" самага вядомага прадстаўніка букалічнай паэзіі эліністычнай эпохі Феакрыта. У варыянце Ф. Князьніна твор атрымаў назву "Цыклоп Паліфем". Паэт часткова захаваў вобразную сістэму арыгінала (антычны міф пра закаханага цыклопа Паліфема), аднак зняў уступны фрагмент філасофскага гучання, у якім Феакрыт звяртаўся да свайго сябра ўрача Нікія і сцвярджаў, што лепшымі лекамі ад моцнага пачуцця служыць спроба выказацца ў песні: "Как бы то ни было, встарь помогло земляку Полифему / Средство такое" [1].

У заўвагах да твора Князьнін даў кароткае тлумачэнне вобразаў антычнай міфалогіі, адаптаваў сюжэт да густаў сучаснікаў. Напрыклад, у "Цыклопе Паліфеме" апускаецца эпітэт музаў "піэрыды", адсутнічае вобраз Кіпрыды, няма напаміну пра стралу, якая па легендзе трапіла ў печань Цыклопа і выклікала каханне (па ўяўленні старажытнах грэкаў, ад кахання балела не сэрца, а печань). Зняты фрагмент арыгінала, у якім Цыклоп прыгадвае сваю маці (німфу), унесены вобразныя змены шляхам выкарыстання іншых лексем: так "алені" ператварыліся ў "коз", "вінаград" – у "кіслыя ягады" ці "парасткі". Замест пазначаных у арыгінале і перакладах (пераклад на рускую мову М. Грабар-Пасек, на англійскую – C.S. Calverley) лілій, маку, гіяцынтаў выкарыстаны больш традыцыйныя назвы кветак: "ружы", "нарцысы", "цюльпаны". Такім чынам, некаторыя маркеры антычнай культуры па волі паэта не перанесены ў польскамоўны твор або заменены на больш традыцыйныя эквіваленты.

Каханне – галоўная тэма ідылій Феакрыта – у "Кіклопе" трактуецца як пачуццё-хвароба, адзінымі лекамі ад якой можа стаць самавыяўленне ў песні. У суадносінах з асноўным жанрам сваёй паэзіі Феакрыт надзяліў міфічнага пастуха Паліфема здольнасцю праз песню выявіць сваё каханне да німфы Галатэі. Сутнасць вобраза кіклопа заключана ў іранічным кантрасце і камічнасці: герой гатовы ахвяраваць адзіным вокам дзеля атрымання прыязнасці з боку німфы. Фізічна моцны, грозны велікан аказаўся слабым перад стыхіяй любоўнага пачуцця. Паказальна, што любоўная песня Паліфема заканчвалася самакрытычнай заўвагай цыклопа: "Не гонись за беглянкой! / Снова найдешь Галатею, а может, кого и получше!" / … / Так успокаивал страсть Полифем, распевая напевы. / Это дешевле ему обошлось, чем любое леченье" [1].

Ва ўступе да ідылій Ф. Князьнін падкрэсліваў розніцу паміж творам Феакрыта і ідыліямі С. Геснера, П. Метастазіё, Ж.Б.Л. Грасэ: "Co za różnica między *Teokrytem*, a trzema innemi, choć tak sławnymi w tym wieku!". На думку паэта, вартасці ідылій еўрапейскіх паэтаў-сучаснікаў "… są blyskotne, uymuią, i nikną wnet z oczu" ("… зіхацяць, прываблiваюць, але тут жа знікаюць"), затое Паліфем Феакрыта выклікае давер чытача, бо сэрца яго "… tak otwarte", што не паверыць яму немагчыма. У заўвагах да твора пісьменнік адзначаў: "… widać tu razem nayżywszą moc miłości z pięknością poezyi, i rzetelność serca z prostotą natury połączone" ("… тут злучаны сіла кахання з прыгажосцю паэзіі і шчырасць сэрца з натуральнасцю прыроды") [3]. Невыпадкова Князьнін даў высокую ацэнку ідыліі Феакрыта перад іншымі ўзорамі жанра. Для паэта-сентаменталіста моц і шчырасць пачуцця – першасная вартасць. У польскамоўнай інтэрпрэтацыі Паліфем не ўяўляецца камічнай фігурай, гэта своеасаблівы вобраз пакутніка, які гатовы ахвяраваць усім, што мае, перад ветранай каханай.

Князьнін заканчваў ідылію павучальнымі словамі Паліфема, у якіх гучала парада карыстацца тым, што далі нябёсы і не квапіцца на тое, чаго ніколі не дасягнуць.

Заключэнне. Такім чынам, ідылія Ф.Д. Князьніна "Цыклоп Паліфем" уяўляе сабой блізкі адпаведнік ідыліі "Кіклоп" Феакрыта, аднак, польскамоўны паэт удала скараціў арыгінал, пакінуў па-за ўвагай некаторыя другасныя дэталі, наблізіў твор да ўяўленняў сучаснікаў. Відавочна, што пісьменніцкая зацікаўленасць ідыліяй Феакрыта тлумачыцца агульнай накіраванасцю творчасці Ф. Князьніна, які працаваў у рэчышчы сентыменталізму з характэрнымі для гэтай мастацкай плыні пачуццёвым суперажываннем і зацікаўленасцю ўнутраным светам чалавека.

Репозиторий ВГУ

Спіс літаратуры
1. Александрийская поэзия : пер. с древнегреч. / сост. М. Грабарь-Пассек. – М.: Худож. лит., 1972. – С. 57–59.
2. Гумбольдт, В. фон. Язык и философия культуры / В. фон Гумбольдт. – М.: Прогресс, 1985. – С. 215.
3. Dzieła Franciszka Dyonizego Kniaznina : w 7 t. / wyd. przez F.S. Dmochowskiego. – Warszawa : Nakł. i drukiem wydawcy, 1828-1829. – T. 2. – 1828. – S. 182–210.

ХУДОЖЕСТВЕННОЕ ОСМЫСЛЕНИЕ «ПРИВЫЧНОГО» СУЩЕСТВОВАНИЯ ЧЕЛОВЕКА В РАССКАЗАХ Л.Н. АНДРЕЕВА

Л.Я. Глазман
Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова

Л.Н. Андреев в своем творчестве значительное внимание уделяет самоопределению личности, ее жизненной позиции. При этом важное место в рассказах писателя занимает человек, погрязший в привычках, боящийся жизни, не способный подняться над своими мещанскими, обывательскими интересами, делающий жизненной доминантой собственный комфорт и спокойствие. Поднимаемая писателем проблема личностной ущербности подается им с самых разных ракурсов и представляет особую *актуальность*, поскольку является неотъемлемым элементом авторской концепции личности, до сих пор не нашедшей должного отклика в отечественном и зарубежном литературоведении.

Цель исследования – выявить специфику отражения «привычного» существования в рассказах Л.Н. Андреева.

Материал и методы. Материалом исследования послужили художественные тексты «малой» прозы Л.Н. Андреева, наиболее показательные с точки зрения избранной нами темы. Произведения писателя рассматривались в сравнительно-типологическом ключе.

Результаты и их обсуждение. Персонажи рассказов Л.Н. Андреева увлечены решением бытовых проблем. И это было бы вполне естественным и разумным, если бы не полная зацикленность на своем обывательском комфорте. Таковы герои рассказа «Осенняя слякоть», настолько поглощенные квартирным вопросом, что перестают понимать, кто они и где находятся: «Где это я видел эту физиономию? Знакомое что-то» [1, 166] – думает внезапно главный герой о своей жене. Сумасшествие приходит даже в сны Анатолия Ивановича. Стало быть, и всю жизнь свою измеряет он комнатами и складными кроватями.

Мещанское счастье персонажей рассказа *«Случай»* тоже зависимо от «мебельного» уюта и практической выгоды. Александру Павловичу, как и всякому обывателю, нравится ощущение собственной доброты и благородства. Но это продолжается только до тех пор, пока его мещанскому спокойствию ничего не угрожает. Неосторожно разбитая лампа, пусть и лишняя в интерьере, становится большей неприятностью, нежели судьба живого человека, а сам герой, позиционирующий себя как благожелательный и сознательный гражданин, на самом деле легко поддается влиянию толпы.

Такого же рода «доброта» иерусалимского купца Бен-Товита из одноименного рассказа. Связана она с выгодным обменом «старого осла на молодого и сильного» [2, 555]. Настроения персонажа вызваны настолько примитивными причинами, что сравнение с новоприобретенным животным не вызывает удивления. Однако и в этом рассказе Л.Н. Андрееву важно не просто констатировать утрату человеком чего-то определяющего его человеческую сущность, а обратить внимание на последствия этой деградации. Действие происходит в момент совершения «мировой несправедливости», казни Христа, мукам которого гротескно противопоставляет автор зубную боль персонажа. В лице Бен-Товита, хотя и не имеющего фактической причастности к казни, выступает карающая толпа, не ведающая, что наказывает, обделяя, прежде всего, себя.

Писатель не просто обличает давно всем известные пороки, но, со свойственной ему экспрессией, показывает их тупиковый путь, приводящий к обезличиванию и «механичности» существования. Потребительское отношение к жизни упрощает ее настолько, что она становится чем-то ненастоящим, призрачным, поскольку человек, стараясь под-

Репозиторий ВГУ